**У. А. Дамасевіч**
(Мазыр, ДУА“Гімназія імя Я. Купалы”)
**Л. М. Шчур**
(Мазыр, УА МДПУ імя І.П.Шамякіна)

## РАЗВІЦЦЁ ПАЗНАВАЛЬНАЙ ЦІКАВАСЦІ ВУЧНЯЎ ПЕРШАГА І ДРУГОГА КЛАСАЎ ДА ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ РАЗНАСТАЙНЫХ ПРЫЁМАЎ ПРАЦЫ

Над праблемай актывізацыі пазнавальнай цікавасці ў розныя перыяды развіцця педагогікі працавалі Я. А. Каменскі, І. Г. Песталоцы, В. А. Сухамлінскі, Я. М. Ільін, С. М. Лысянкова, Ш. А. Аманашвілі, Г. І. Шчукіна, Н. Р. Марозава, М. І. Запрудскі, С. С. Кашлеў, А. А. Карзюк і інш., а таксама псіхолагі Л. І. Бажовіч, В. В. Давыдаў, А. М. Лявонцьеў, А. К. Маркава, В. М. Мясішчаў, С. Л. Рубінштэйн.

На аснове тэарэтычных даследаванняў намі распрацаваны разнастайныя прыёмы працы, якія садзейнічаюць развіццю пазнавальнай цікавасці вучняў першага і другога класаў да вывучэння беларускай мовы.

З першых дзён навучання, адразу пасля курса “Уводзіны ў школьнае жыццё”, пачынаем працаваць над развіццём павагі да беларускага слова, фарміраваннем жадання спасцігаць нацыянальную культуру, усведамляць сябе беларусам.

Кожны ўрок беларускай мовы ў першым і другім класах пачынаецца з арганізацыйна-матывацыйнага этапу, падчас якога дзеці не толькі рыхтуюцца да ўспрымання тэмы ўрока, але і атрымліваюць станоўчую матывацыю ды вывучэння беларускай мовы, у іх развіваецца ўменне ўспрымаць маўленне на слых. На першых уроках дзеці толькі слухаюць і стараюцца зразумець, пра што ім гавораць. А ўжо праз некалькі ўрокаў вучні ўступаюць у дыялог з настаўнікам. Сістэматычнае выкарыстанне апісанага прыёму дазваляе развіваць жаданне пазнаваць нешта новае, паляпшае артыкуляцыйныя ўменні, ствараe станоўчы настрой.

Ніводзін урок беларускай мовы не абыходзіцца без маўленчай размінкі. Гэты прыём дапамагае не толькі развіваць артыкуляцыйныя навыкі, але і пашырае лексічны запас, дае новыя веды, а значыць развівае маўленчыя здольнасці вучняў. Падчас правядзення маўленчай размінкі вучні не проста паўтараюць за настаўнікам, але і выконваюць наступныя заданні: чытаюць хутка, чытаюць павольна, вымаўляюць з рознай інтанацыяй, вымаўляюць у пары, вымаўляюць, робячы лагічны націск на выдзеленае слова, адказваюць на пытанні па змесце маўленчай размінкі, тлумачаць лексічнае значэнне слоў. Адзін з прыкладаў маўленчай размінкі – гульня “Хлопчыкі-дзяўчынкі”. Хлопчыкі імітуюць гукі і рухі цягніка, дзяўчынкі – гукі верабейкі. Па камандзе “Хлопчыкі!” хлопчыкі вымаўляюць “чух-чух-чух” і рухаюць рукамі. Па камандзе “Дзяўчынкі!” дзяўчынкі варочаюць галавой справа налева і вымаўляюць “чык-чырык”. Атрымліваецца сінтэз маўленчай размінкі і фізкультхвілінкі, забяспечваецца здароўезберадджэнне вучняў, ствараецца пазітыўны настрой, што спрыяе развіццю пазнавальнай цікавасці.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Сістэматычна выкарыстоўваюцца дыдактычныя гульні. З першага ўрока можна праводзіць гульні з дапамогай падручніка “Знайдзі і пакажы”, ”Перакладчыкі”, “Падпішы малюнак”, “Паўтарай, не зявай”.

Для развіцця вуснага маўлення выкарыстоўваюцца гульні “Будзь уважлівы”, “Дапоўні сказ”, “Дадай слова”. Каб развіваць лагічнае мысленне, можна пагуляць у гульню “Знайдзі лішняе”, або “Выпраў памылку”.

Некаторым дзецям цяжка даецца запамінанне літар. Таму, калі пачынаецца вывучэнне літар, гуляем з імі (гульні “Люстэрка”, “Хованкі” “Чараўнікі”, “Суседкі”).

У другім класе змест гульняў змяняецца. Яны спрыяюць развіццю маўлення і мыслення, служаць сродкам актуалізацыі ведаў, павышаюць матывацыю для далейшага навучання. Напрыклад, у гульні “Апрані сказ” дзецям даецца сказ, які яны павінны, дадаючы па адным слове, “апрануць”.

Улічваючы той факт, што цікавасць з’уляецца лепшым стымулам да навучання, трэба імкнуцца выкарыстоўваць кожную магчымасць, каб разгрузіць дзіця сродкамі гульнёвай дзейнасці ў працэсе навучання мове.

На ўроках таксама трэба вучыць аналізаваць, параўноўваць, абагульняць, рабіць вывады, што спрыяе падвядзенню вучняў да ўмення самастойна здабываць веды, а не атрымліваць іх у гатовым выглядзе. Таму пры вывучэнні арфаграфічных правілаў ствараюцца праблемныя сітуацыі, падчас рашэння якіх дзеці “адкрываюць” новае правіла, здабываюць новыя веды.

Паспяховае рашэнне праблемных сітуацый абуджае цікавасць да прадмета. А гэта станоўча ўплывае на развіццё актыўнасці, самастойнасці, моўнага чуцця вучняў, на павышэнне іх пісьменнасці, агульнага развіцця.

Уключыцца ў актыўную разумовую дзейнасць ужо з першых хвілін урока дапамагае прыём ”Чыстапісанне-разважанне”. Кожны раз матэрыял для хвілінкі чыстапісання падбіраецца так, каб ён служыў лагічным “масцікам” для пераходу да новага этапа ўрока. Па меры магчымасці змест усяго ўрока трэба рабіць тэматычным (у залежнасці ад практыкаванняў падручніка).

Асноўныя тэмы курса беларускай мовы эфектыўна вывучаць з дапамогай апорных табліц, якія трэба складаць разам з вучнямі. У другім класе – гэта *“Правапіс слоў з літарамі о, э-а”, “Правапіс слоў з літарамі е, ё-я”, “Правапіс слоў з ў”.*

У пачатку вывучэння тэмы гэта табліца – чысты ліст ватмана. На ўроку адкрыцця новых ведаў правіла прадстаўляем у выглядзе схемы, апоры.

Калі схемы звязаны паміж сабой, то змяшчаем іх у табліцу на дошку. Схема-апора дапамагае дзецям усвядоміць, асэнсаваць усё, што адбываецца на ўроку, выдзеліць галоўнае, растлумачыць, даказаць свае дзеянні. Разнастаіць працу з апорамі дапамагаюць прыёмы “Аднаві апору”, “Лаві памылку”. Настаўнік закрывае частку апоры або дадае “лішнія аб’екты”, а вучні аднаўляюць змест схемы.

Вучні паспяхова засвойваюць вучэбны матэрыял, калі праяўляюць пазнавальную самастойнасць. З гэтай мэтай добра выкарыстоўваць прыём алгарытмізацыі. Алгарытмы спрыяюць развіццю ў вучняў лагічнага мыслення, фарміраванню навыкаў самакантролю пры вырашэнні арфаграфічнай задачы. Для таго, каб убачыць, ці асэнсавана дзеці працуюць па алгарытму, выкарыстоўваюцца заданні “Закончы алгарытм”, “Аднаві алгарытм”.

Неабходным і абавязковым з'яўляецца фарміраванне вучэбнай рэфлексіі на ўсіх этапах ўрока. Яна стварае спрыяльныя ўмовы для развіцця пазнавальнай цікавасці, усведамлення вучнямі сваёй вучэбнай дзейнасці, выступае важным механізмам развіцця асобы.

Рэфлексію настрою і эмацыйнага стану можна ажыццяўляць з дапамогай наступных прыёмаў: “Пакажы настрой”, “Фотаздымак”, “Кветка настрою”, “Лінеечка поспеху”. Для фарміравання змястоўнай вучэбнай рэфлексіі ў практыцы выкарыстоўваюцца такія прыёмы, як “Закончы сказ”, “Сінквейн”, ”Кластар”, “Ведаю, хачу ведаць, даведаўся”, «Незакончаны сказ», “Метад пяці пальцаў”.

Работа на ўроку ў парах і групах з’яўляецца прывабнай для дзяцей, таму што рэалізуе імкненне да сумеснага пошуку, дазваляе ажыццяўляць дзеянні ў станоўчых умовах – не ва ўсіх на віду і не аднаму. У першым класе аддаецца перавага працы ў парах, прапануецца складанне

МГПУ им. И.П. Шамякина

невялічкіх дыялогаў па пэўнай тэме. У другім класе, акрамя працы ў пары, арганізоўваецца праца ў групах.

Яшчэ адзін прыём мы называем “Воблака слоў”. На слайдзе або на дошцы markdownрознымі колерамі і шрыфтамі надрукаваны 10–15 слоў (слоўнікавых або тэматычных) вертыкальна, гарызантальна, па дыяганалі.

Вучні кожнай групы на працягу адной хвіліны чытаюць гэтыя словы. Слайд або дошка закрываецца, кожная група на лісточку піша словы. Потым каманды абменьваюцца работамі для праверкі. Вучні выпраўляюць памылкі, дапісваюць словы, якіх не хапае. Вызначаецца пераможца. Гэты прыём дазваляе дзецям развіваць камунікатыўныя навыкі, пашыраць лексічны запас, развіваць якасці асобы.

**Літаратура**

1. З любоўю да мовы: практычны матэрыял для настаўнікаў пачатковых класаў / склад. І.А. Гімпель, Г.В. Нарубіна; адк. за выпуск Г.У. Грыгаровіч. – Мінск: Беларускі вуч.-метад. цэнтр Мін. адукацыі, 1992. – 187 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина